Мяснікова Н.

# КАМАНДЗІР ТАНКАВАГА ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯ

У абласны краязнаўчы музей паступілі дакументы, фатаграфіі, асабістыя рэчы, якія расказваюць аб слаўным баявым шляху нашага земляка Героя Савецкага Саюза Фядосія Міхайлавіча Аўхачова.

Фядосій Міхайлавіч нарадзіўся ў 1909 годзе ў в. Машавое Касцюковіцкага раёна. Дзіцячыя гады ён правёў у роднай вёсцы, вучыўся ў школе, працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1930 годзе ён быў прызван у рады Чырвонай Арміі. Як дысцыплінаванага і прыкладнага байца, камандаванне накіравала яго на вучобу ў бронетанкавую школу. З гэтага часу многія гады свайго жыцця Фядосій Міхайлавіч правёў у Савецкай Арміі.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны застаў Фядосія Аўхачова камандзірам падраздзялення ў адной з танкавых часцей. Не раз адважныя танкісты пакрывалі сябе нязгаснай славай у жорсткіх схватках з ворагам. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гэтых баях, урад узнагародзіў Фядосія Міхайлавіча ардэнамі Савецкага Саюза.

Пры вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Польшчы камандзір танкавага батальёна маёр Аўхачоў вызначыўся яшчэ раз. У канцы сакавіка 1945 года яго падраздзяленне ў складзе 2-га Беларускага фронта наблізілася да порта Гдыня.

Камандаванне дало загад маёру Аўхачову заняць прадмесце Гдыні – Цопат. Праціўнік стварыў вакол горада ўмацаванні. Наступаць тут можна было толькі на вачах у непрыяцеля па добра прыстрэлянай мясцовасці, або праз суседні лес, які фашысты лічылі непраходным для танкаў.

Рыхтуючыся да выканання задання, маёр Аўхачоў уважліва вывучыў мясцовасць і выявіў у лесе вузкую, ледзь прыкметную сцежку, якая вяла да горада. Камандзір батальёна прыняў рашэнне правесці баявыя машыны праз лес па гэтай сцежцы. Тоўстыя дрэвы танкісты пілілі, тонкія ламалі танкамі. Пераадолеўшы ўсе перашкоды, маёр Аўхачоў вывеў свае грозныя машыны на ўчастак паміж прадмесцем і горадам, дзе праціўнік нават не чакаў паяўлення савецкіх танкаў. Момант раптоўнасці дапамог танкістам выканаць загад і пазбегнуць страт. Варожы гарнізон Цопата, апынуўшыся пад пагрозай быць адрэзаным, прабаваў бегчы, але танкісты агнём сваіх машын перагарадзілі ворагу шлях да адступлення. Першыя ж падбітыя на шасэ машыны стварылі на дарозе пробку, і ўся варожая тэхніка засталася на месцы.

Развіваючы поспех, батальён маёра Аўхачова пачаў наступленне на Гдыню. Дарогу наступаючым перагарадзіў процітанкавы роў і тры лініі траншэй. Было прынята і ажыццёўлена рашэнне: частка танкаў вядзе агонь па ворагу, экіпажы іншых машын робяць праход праз процітанкавы роў. На плячах у ворага танкісты ўварваліся ў горад. Фашысты кінуліся да порта і пачалі пагрузку на судны. Маёр Аўхачоў накіроўвае свой танкавы батальён на захват порта. Шлях танкам перагарадзіў ўзарваны мост. Фядосій Міхайлавіч прымае смелае рашэнне – правесці машыны па абломках маста. Асцярожна прайшла галаўная машына, за ёй другая, трэцяя... Танкі пераадолелі непраходную перашкоду. Фашысты, не паспеўшы пагрузіцца на судны, пачалі адыходзіць уздоўж берага бухты, але трапілі пад агонь суседняга падраздзялення. Горад і порт Гдыня былі свабодныя. Вораг панёс пры гэтым велізарны ўрон.

Радзіма высока ацаніла заслугі Фядосія Міхайлавіча Аўхачова. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР за баявыя аперацыі па вызваленню горада і порта Гдыня і праяўленыя пры гэтым мужнасць, геройства і адвагу яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля Залатая Звязда.

У Польшчы на адной з плошчаў горада Гдыні на гранітным пастаменце горда стаіць магутны савецкі танк. Гэта – адна з тых машын падраздзялення, якім камандаваў маёр Фядосій Міхайлавіч Аўхачоў.

**Мяснікова, Н. Камандзір танкавага падраздзялення / Н. Мяснікова // Магілёўская праўда. — 1959. — 27 лістапада. — С. 4.**